Пасябраваць з музай

# Буктрэйлеры — Году малой радзімы

**Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі працягнуў творчы конкурс «Кніга з экрана» і запрасіў школьнікаў, навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных установ, студэнцкую і працуючую моладзь да ўдзелу ў другім сезоне.**

Гэта могуць быць як індывідуальныя канкурсанты, так і творчыя групы хлопчыкаў і дзяўчынак. Другая частка праекта прысвечана Году малой радзімы, а паўтарахвілінныя міні-фільмы, створаныя маладымі сцэнарыстамі, аператарамі і рэжысёрамі, якія папулярызуюць тую ці іншую кнігу, прапанавана зрабіць па творах беларускіх аўтараў. Арганізатары выказваюць надзею, што да конкурсу па стварэнні кніжных трэйлераў далучацца і айчынныя выдавецтвы.

Другі сезон стартаваў 18 мая. Вынікі плануецца падвесці ў пачатку жніўня. Традыцыйна конкурс пройдзе ў тры этапы: да 28 чэрвеня раённыя, да 24 ліпеня абласныя і да 8 жніўня — рэспубліканскі. Ацэніць творчыя работы прафесійнае журы. Узнагароджанне пераможцаў першага і другога сезонаў адбудзецца ў верасні падчас Дня беларускага пісьменства, які сёлета плануецца правесці ў Бялынічах, паведамілі ў ЦК БРСМ.

Першы сезон конкурсу быў прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі. У ім бралі ўдзел 360 творчых работ, падрыхтаваных навучэнскай і працуючай моладдзю. На перамогу ў рэспубліканскім фінале прэтэндаваў 91 буктрэйлер па кнігах ваеннай тэматыкі, 48 узялі ўдзел у спецыяльнай намінацыі «Найлепшы буктрэйлер анлайн».

Арганізатарамі рэспубліканскага творчага конкурсу выступаюць БРСМ, Міністэрства інфармацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Нацыянальная бібліятэка. Мэта — папулярызацыя чытання і творчасці сучасных айчынных аўтараў, актуалізацыя цікавасці да мастацкай літаратуры, стварэнне рэкламнага прадукту для кніг.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**